УДК 37.013+37.036(476)

# Асноўныя напрамкі развіцця педагагічнай тэорыі і практыкі ў сучаснай сістэме мастацкай адукацыі

***Ушакова В.М., Шаура Г.Ф.***
*Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", Мінск*

*У артыкуле разглядаюцца пытанні, звязаныя з сучасным станам развіцця педагагічнай тэорыі і практыкі і іх важнасцю ў працэсе мастацкай адукацыі і эстэтычнага выхавання падрастаючага пакалення. Даецца характарыстыка бесперапыннай адукацыі, якая разумеецца як паэтапны і пажыццёвы працэс, што забяспечвае пастаяннае папаўненне і пашырэнне ведаў у людзей рознага ўзросту. Паказаны шляхі вырашэння найважнейшых праблем, звязаных з паскарэннем навукова-тэхнічнага прагрэсу, ускладненнем зместу дзейнасці выпускнікоў навучальных устаноў мастацкага профілю, са станаўленнем рыначных адносін, з апорай на нарматыўныя дакументы рэгіянальнага ўзроўню.*

*Значнай з'явай у далейшым вывучэнні глыбінных пластоў традыцыйнага народнага, выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва стала адкрыццё адпаведных факультэтаў і спецыялізацый у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах па падрыхтоўцы кадраў спецыялістаў для сферы народнага мастацтва, промыслаў і рамёстваў. Сёння ў гэтай сферы ўжо актыўна працуюць выпускнікі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, а таксама спецыялісты, якія скончылі іншыя навучальныя ўстановы, што забяспечваюць мастацка-творчы і выхаваўчы працэс. На сучасным этапе ажыццяўляецца пошук новых падыходаў, далейшых навукова абгрунтаваных шляхоў развіцця мастацтва ў нашай рэспубліцы. Менавіта гэтыя пытанні з'яўляюцца асноўным стрыжнем дзяржаўнай праграмы і новым зместам падрыхтоўкі і прафесійнай дзейнасці кадраў у галіне мастацкай культуры Беларусі.*

***Ключавыя словы:*** *адукацыя, выхаванне, тэорыя, практыка, культура, мастацтва, навукова-тэхнічны прагрэс, бесперапынная адукацыя, прынцыпы, стратэгія, прыярытэты, гуманізацыя.*

*(Искусство и культура. – 2022. – № 2(46). – С. 91–94)*

# Basic Development Directions of Pedagogical Theory and Practice in the Contemporary System of Art Education

***Ushakova V.M., Shauro G.F.***
*Education Establishment "Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk*

*The article discusses issues related to the current state of the development of pedagogical theory and practices and their importance in the process of art education and aesthetic education of the younger generation. The characteristic of continuous education is given, which is understood as a phased and lifelong process, that provides constant replenishment and expansion of people's knowledge in different ages. Ways are shown to solve the most important problems associated with the acceleration of scientific and technological progress, the complication of the content of the activities of art education establishment graduates, the shaping of market relations with a support of regulatory documents.*

*Opening folk art and crafts faculties and specializations at universities and secondary special education establishments became an important event in the further study of deeper layers of traditional folk, fine and decorative applied art. Nowadays Belarusian State University of Culture and Arts as well as other education establishment graduates actively work in this sphere and ensure the art creative and education process. The search for new approaches, further scientifically grounded ways for the development of art in our Republic takes place at present. These issues are basic directions of the state program and the new contents of training and professional activities of art culture workers in Belarus.*

***Key words:*** *education, theory, practice, culture, art, scientific and technological progress, continuing education, principles, strategy, priorities, humanization.*

*(Art and Cultur. – 2022. – № 2(46). – P. 91–94)*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: shauro-hudoghnik@rambler.ru – Г.Ф. Шаура*

Найважнейшай навукай аб выхаванні чалавека з’яўляецца педагогіка, змест якой накіраваны на тое, як дапамагчы яму стаць духоўна багатым, творча актыўным, знайсці раўнавагу з прыродай і грамадствам. Будучы самастойнай навукай, педагогіка развіваецца ў цеснай узаемасувязі з псіхалогіяй, філасофіяй, сацыялогіяй, этыкай, эстэтыкай, фізіялогіяй, гісторыяй, матэматыкай, эканомікай і інш., узаемадзеянне паміж якімі ажыццяўляецца ў наступных аспектах: запазычанне і ўзбагачэнне іншых навук ідэямі, тэорыямі, паняццямі з адпаведнай інтэрпрэтацыяй, а таксама выкарыстанне метадаў і методык для навуковых даследаванняў.

Неабходныя ўмовы развіцця педагагічнай тэорыі і практыкі забяспечваюцца сёння цеснымі сувязямі, якія склаліся з філасофіяй і псіхалогіяй. Прагрэсіўныя педагогі ўсіх часоў і народаў вылучалі патрабаванні разумець чалавечую прыроду, яе патрэбы і магчымасці, выкарыстоўваць механізмы псіхічнага развіцця асобы ў арганізацыі працэсу навучання і выхавання.

Мэта артыкула – прасачыць вядучую ролю педагогікі ў мастацка-адукацыйным і выхаваўчым працэсе маладога пакалення.

**Педагогіка як самастойная галіна навукі.** Педагогіка – галіна культуры, прычым сам чалавек разглядаецца як суб’ект культурнага развіцця праз мастацтва, навуку, практычную дзейнасць людзей па абмене ведамі, каштоўнасцямі, вопытам творчай дзейнасці і індывідуальным вопытам. Уплыў культуры на чалавека залежыць, перш за ўсё, ад ступені далучэння асобы да вышэйшых каштоўнасцей культуры і ад самаўдасканалення [1, с. 9–18].

Усе віды педагагічнага ўздзеяння дазваляюць выхаваўчаму працэсу дасягнуць высокага ўзроўню цэласнасці і ўлічыць пры гэтым змены ў жыцці падрастаючага пакалення. Паскарэнне тэмпаў развіцця грамадства вызначае патрэбу ў папаўненні ведаў на працягу ўсяго жыцця чалавека. Сутнасцю сістэмы бесперапыннай адукацыі становіцца не толькі набыццё новых ведаў, новага ўзроўню адукацыі, але і гатоўнасць да новых відаў дзейнасці, а, такім чынам, гэта не толькі вынік засваення новых ведаў, але і даследчы шлях атрымання гэтых ведаў [1, с. 152–157].

Бесперапынная адукацыя разумеецца як паэтапны і пажыццёвы працэс, які забяспечвае пастаяннае папаўненне і пашырэнне ведаў у людзей рознага ўзросту. Яго асноўныя этапы:

• навучанне, выхаванне і развіццё чалавека – дзіцяча-юнацкая адукацыя;

• вучэбная дзейнасць у перыяд дарослага жыцця – адукацыя дарослых.

Мэты бесперапыннай адукацыі моладзі і дарослых людзей заключаюцца ў развіцці самастойнасці, мэтанакіраванасці і адказнасці ў вучняў, ва ўмацаванні здольнасці адаптавацца да пераўтварэнняў, што адбываюцца ў эканоміцы, культуры, грамадстве ў цэлым. Бесперапынная адукацыя прадстаўлена такімі формамі адукацыі, як пажыццёвая, пачатковая, дадатковая, паслядыпломная, прафесійная і інш. Бесперапынная адукацыя – гэта працэс росту адукацыйнага патэнцыялу асобы на працягу жыцця, арганізацыйна забяспечаны сістэмай дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў і адпаведны патрэбам асобы і грамадства. У яго ўключана мноства адукацыйных структур – асноўных і паралельных, базавых і дадатковых, дзяржаўных і грамадскіх, фармальных і нефармальных.

Пачынаючы з другой паловы XX стагоддзя, пры пераходзе чалавецтва да постіндустрыяльнага (інфармацыйнага) этапу развіцця, сістэма адукацыі стала супярэчыць новай сацыяльнай сітуацыі. Дэмаграфічны выбух у апошняй чвэрці XX стагоддзя з прычыны росту працягласці жыцця, павелічэнне вольнага часу насельніцтва стварылі ўмовы і патрэбу ў бесперапыннай адукацыі на працягу ўсяго жыцця. Ідэя падобнай адукацыі стала тэарэтычнай асновай абнаўлення сістэмы адукацыі ва ўсім свеце. Сёння яна ўключае ў сябе ўсе віды адукацыі і выхавання, якія праходзіць кожны чалавек у сваім жыцці.

Сістэма адукацыі, у адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, уключае ў сябе: сістэму дашкольнай адукацыі, сістэму агульнай сярэдняй адукацыі, сістэму прафесійна-тэхнічнай адукацыі, сістэму сярэдняй спецыяльнай адукацыі, сістэму вышэйшай адукацыі, сістэму пасляўніверсітэцкай адукацыі, сістэму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, сістэму дадатковай адукацыі дарослых, сістэму спецыяльнай адукацыі. Напрыклад, у Беларусі, не толькі ў сталіцы, але і ва ўсіх абласных і раённых гарадах і пасёлках, паспяхова функцыянуюць цэнтры дадатковай адукацыі, дамы рамёстваў, дзіцячыя мастацкія школы і студыі, у якіх актыўна вядзецца мастацка-творчы працэс. Навучэнцы засвойваюць сучаснае і традыцыйнае народнае мастацтва, знаёмяцца з глыбіннымі пластамі нацыянальнай мастацкай культуры [2, с. 11].

**Канцэпцыя бесперапыннай мастацкай адукацыі.** Сёння перад Рэспублікай Беларусь стаяць задачы асэнсавання важнасці нацыянальных традыцыя, захавання самабытнасці і своеасаблівасці нацыянальнай культуры, народнага мастацтва, стварэння новай канцэпцыі мастацкай адукацыі і выхавання. Усё гэта абумоўлівае пэўны спектр напрамкаў і задач беларускай культуры і сістэмы адукацыі. Сучасныя патрабаванні да мастацкага выхавання і адукацыі прадугледжваюць наяўнасць

бесперапынных адукацыйных структур на аснове паэтапнага, мэтанакіраванага развіцця асобы ад дашкольнага ўзросту да прафесійнай дзейнасці чалавека. Рашэнне гэтай задачы, у сваю чаргу, немагчыма без эфектыўнага выкарыстання назапашанага тэарэтычнага і практычнага вопыту па пераемнасці змястоўных і працэсуальных бакоў навучання і выхавання, паколькі агульнакультурныя і мастацкія веды і навыкі не могуць паўнавартасна сфарміравацца толькі ў перыяд навучання ў вышэйшай школе. Яны складаюцца паступова, у залежнасці ад узроставых і індывідуальных асаблівасцей творча адоранай асобы на працяглым бесперапынным і паслядоўным шляху адукацыйнага і выхаваўчага працэсу.

Рэалізацыя канцэпцыі бесперапыннай мастацкай падрыхтоўкі спецыялістаў у сферы мастацкай творчасці прадугледжвае выкананне наступных задач:

– ажыццяўленне пераемнасці ў вырашэнні арганізацыйных, метадычных і адукацыйных задач ад дашкольных вучэбна-выхаваўчых устаноў да падрыхтоўкі ва ўстановах вышэйшай адукацыі спецыялістаў і далейшай паслядыпломнай адукацыі;

– уключэнне ў сістэму бесперапыннай адукацыі ўсіх відаў і тыпаў адукацыйных устаноў, у тым ліку гімназій, ліцэяў, каледжаў, устаноў вышэйшай адукацыі, як дзяржаўных, так і недзяржаўных;

– стварэнне новых пакаленняў адукацыйных стандартаў, вучэбных праграм бесперапыннай адукацыі для ўсіх яе звенняў з арыентацыяй іх зместу на інтэграцыю ў сістэму сусветнай культуры, а таксама стварэнне адпаведнай вучэбна-матэрыяльнай базы для забеспячэння навучальнага працэсу на ўсіх ступенях яго функцыянавання.

Сярэднія спецыяльныя мастацкія навучальныя ўстановы рыхтуюць кадры для працы ў сферы культуры, мастацтва, арганізацыйна-метадычнай дзейнасці ў галіне народнай творчасці, а таксама для выкладчыцкай і выхаваўчай работы ў агульнаадукацыйных школах, дашкольных выхаваўчых установах.

Спецыялістаў з вышэйшай мастацкай і мастацка-педагагічнай адукацыяй рыхтуюць Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў, спе-цыялізаваныя факультэты Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава, Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і інш.

У сучасных умовах мастацкая адукацыя павінна стаць формай і інструментам далучэння моладзі да культурнай спадчыны як духоўнага багацця чалавека. Эфектыўнае развіццё прафесійных якасцей і творчых здольнасцей будучых спецыялістаў у галіне мастацкай творчасці можа ажыццяўляцца пры:

– павышэнні прэстыжу мастака-творцы, мастака-педагога, яго аўтарытэту, шырокай культурнай адукаванасці, прафесійнай кампетэнтнасці і агульнай эрудыцыі як носьбіта высокіх духоўных ідэалаў;

– сістэматычным фарміраванні асэнсаванай прафесійнай арыентацыі, якая грунтуецца на высокім узроўні яе матывацыі;

– комплексным фарміраванні светапогляду, мыслення, прафесійнай пісьменнасці на працягу ўсяго перыяду бесперапыннай мастацкай падрыхтоўкі;

– стварэнні ўмоў (эканамічных, матэрыяльна-тэхнічных, педагагічных) для праявы прафесійнай самастойнасці, самарэалізацыі і самасцвярджэння вучняў у працэсе вучэбнай і творчай дзейнасці.

**Тыпы навучальных устаноў і змест адукацыі.** Неабходна адзначыць, што ўстановы адукацыі падзяляюцца на наступныя тыпы: установы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі; установы дадатковай адукацыі дарослых; выхаваўча-аздараўленчыя ўстановы адукацыі; сацыяльна-педагагічныя ўстановы; спецыяльныя вучэбна-выхаваўчыя ўстановы; спецыяльныя лячэбна-выхаваўчыя ўстановы. Установы адукацыі могуць быць дзяржаўнымі і прыватнымі [3, раздзел 1 (арт. 11, 12, 13, 14, 18)].

Шматлікія навукоўцы лічаць, што фарміраванне матывацыйнага асяроддзя неабходна пачынаць ужо ў пачатковай школе, улічваючы фізіялагічныя і псіхічныя асаблівасці дзіцяці. Укараненне сістэмы бесперапыннай адукацыі прадугледжвае і ўдасканаленне сістэмы дадатковай адукацыі.

У сучасных умовах адбываецца мадэрнізацыя адукацыі ў многіх краінах свету. Працэс мадэрнізацыі ёсць працэс рэфармавання адукацыі, які закрануў многія цывілізаваныя краіны свету і які звязаны з сучаснымі сацыяльна-эканамічнымі, палітычнымі і культуралагічнымі праблемамі.

Змест адукацыі павінен быць на ўсіх яе ступенях накіраваны на дасягненне галоўнай мэты выхавання, а менавіта фарміраванне ўсебакова і гарманічна развітай асобы, і будаваць яго неабходна на строга навуковай аснове, г.зн. уключаць у яго толькі прынятыя і ўстойлівыя ў навуцы факты і навучальныя матэрыялы. У сваю чаргу, тэарэтычны матэрыял павінен спалучацца з практыкай, а практыка, – узгадняцца з вытворчым працэсам. Такім чынам, агульная школьная адукацыя, як бачым, павінна ўзаемадзейнічаць з тэхнічнай і працоўнай адукацыяй і арыентавацца на вышэйшую адукацыю.

На дадзеным этапе адбываецца ўскладненне зместу дзейнасці выпускнікоў навучальных устаноў, што патрабуе ўвядзення ступеняў ва ўзроўні адукацыі. Чалавек на працягу ўсяго жыцця атрымлівае магчымасць удасканальваць свае веды. Аднак ва ўмовах навукова-тэхнічнага прагрэсу патрэба ў абнаўленні атрыманых ведаў значна паскараецца. Узнікае неабходнасць у набыцці ўніверсальных ведаў для выпускнікоў навучальных устаноў. У працэсуальным плане ўстойлівасць ведаў дасягаецца за кошт распрацоўкі сучасных тэхналогій навучання, якія забяспечваюць канкурэнтаздольнасць спецыяліста на рынку працы і магчымасць самаразвіцця.

Асноўным практычным інструментам рэалізацыі патрэбы грамадства і асобы ў сучасных ведах з’яўляецца гуманізацыя адукацыі, гэта значыць, дадатак гуманітарнай культуры разам з натуральна-тэхнічнай культурай, якая дазваляе выпускніку навучальнай установы вырашаць складаныя задачы. Неабходна ўлічваць, што развіццё сістэмы бесперапыннай адукацыі цесна звязана з сацыяльна-эканамічным і палітычным становішчам у краіне.

Такім чынам, змест адукацыі – гэта сістэма атрыманых ведаў, уменняў і навыкаў, якія ў далейшым будуць прымяняцца ў вытворчай працы і павінны адпавядаць пастаўленым мэтам развіцця чалавека.

Шматступенчатая сістэма падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, прынятая ў Рэспубліцы Беларусь з 1994 года, і наступная дыверсіфікацыя вышэйшых навучальных устаноў ускладнілі раней існуючую структуру і кіраванне ёю. У цяперашні час навучальныя ўстановы сістэмы вышэйшай адукацыі Беларусі дзеляцца на чатыры тыпы. Асноўнымі тыпамі вышэйшых навучальных устаноў з’яўляюцца класічны ўніверсітэт, профільны ўніверсітэт або акадэмія, інстытут, вышэйшы каледж.

Класічныя і профільныя ўніверсітэты, а таксама інстытуты адносяцца да вышэйшых навучальных устаноў універсітэцкага тыпу.

Зараз у сістэме вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь склалася разгалінаваная сетка вышэйшых навучальных устаноў, якія ажыццяўляюць падрыхтоўку спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі для розных галін народнай гаспадаркі. Фарміраванне і развіццё адукацыйнай сістэмы ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляецца ў адпаведнасці з канстытуцыйнымі патрабаваннямі і гарантыямі ў галіне адукацыі, якія забяспечваюць роўнасць ў яго атрыманні, адзінства адукацыйнай сістэмы і пераемнасць усіх ступеняў навучання.

Развіццё нацыянальнай сістэмы адукацыі грунтуецца на наступных асноўных прынцыпах: прыярытэце агульначалавечых каштоўнасцей; нацыянальна-культурнай аснове; навуковасці; арыентацыі на сусветны ўзровень адукацыі; гуманізме; сувязі з грамадскай практыкай; экалагічнай накіраванасці; пераемнасці і бесперапыннасці; адзінстве навучання, духоўнага і фізічнага выхавання; дэмакратызме; свецкім характары, абавязковасці базавай адукацыі [3, раздзел 1, арт. 2].

**Заключэнне.** Стратэгічнай мэтай развіцця Рэспублікі Беларусь з'яўляецца стварэнне нацыянальнай сістэмы адукацыі, якая адпавядае патрэбам асобы, грамадства і дзяржавы, падрыхтоўкі новых пакаленняў да жыцця і працы ў грамадстве з устойлівай і сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікай.

Найважнейшы прыярытэт у сферы адукацыі – павышэнне якасці ведаў падрастаючага пакалення ад развіцця асобаснага патэнцыялу да забеспячэння высокага ўзроўню ведаў, навыкаў, кампетэнцый, якія адказваюць патрэбам грамадства. У сферы культуры асноўная ўвага будзе нададзена беражліваму стаўленню да аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны з дапамогай іх рэканструкцыі і рэстаўрацыі, распрацоўкі анлайн-пляцовак для дэманстрацыі культурных падзей, стварэння электронных каталогаў гісторыка-культурных помнікаў Рэспублікі Беларусь, укаранення распрацовак у сферы інфармацыйных тэхналогій.

Усе колькасныя і якасныя пераўтварэнні ў сістэме адукацыі Рэспублікі Беларусь павінны спрыяць вырашэнню найважнейшых стратэгічных задач, якія стаяць перад айчынным грамадствам на сучасным этапе. Гэта пераадоленне адставання па ключавых, перш за ўсё навукаёмістых, галінах гаспадаркі; забеспячэнне развіцця ў Беларусі сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі; стварэнне спрыяльных умоў для ўсебаковага развіцця нацыянальнай культуры; фарміраванне ўмоў для паступовага пераходу да постіндустрыяльнага, інфармацыйнага грамадства [4].

**ЛІТАРАТУРА**


1. Ушакова, В.М. Педагогика: учеб.-метод. пособие для студентов учреждений высшего образования, обучающихся по непедагогическим специальностям / В.М. Ушакова. – Минск: Зорны Верасок, 2014. – 394 с.
2. Шауро Г.Ф. Народное искусство в практике современного образовательного процесса / Г.Ф. Шауро // Материалы Республиканской научно-практической конференции, посвященной 25-летию образования кафедры народного декоративно-прикладного искусства, Минск, 25 окт. 2018 г. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск, 2019. – С. 10–13.
3. Кодекс Республики Беларусь об образовании. – Минск: РИВШ, 2011. – 352 с.
4. Основные положения проекта Программы социально-экономического развития Республики Беларусь на 2021–2025 годы [Электронный ресурс]. – Минск, 2021. – Режим доступа: https://drive.google.com/file/d/1r8tJ6UogLHRTzlWrCEtvnIzZ1AEMmmeQ/view?usp=sharing. – Дата доступа: 01.03.2022.


*Пастыпіў у рэдакцыю 22.04.2022*